Радыё Свабода

ВЫБАРЫ-2020

Штабу Ціханоўскай не далі правесьці мітынг у Тучынскім скверы

07 жнівень 2020, 19:28

Штабу Сьвятланы Ціханоўскай не далі правесьці мітынг у Тучынскім сквэры Менску.

Каманда Сьвятланы Ціханоўскай на чале з Вольгай Кавальковай увечары 7 жніўня прыехала ў Тучынскі сквэр на Харкаўскай вуліцы ў Менску, каб наладзіць там абсталяваньня для правядзеньня агітацыйнага мітынгу.

Неўзабаве на месца прыехаў кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёну Сяргей Шкруднеў і заявіў, што ў сквэры ідуць рамонтныя працы і праводзіць мерапрыемства там нельга, піша Tut.by.

Камандзе Ціханоўскай давялося забраць абсталяваньне і зьехаць, напісалі ў прэс-службе аб'яднанага штабу.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Месцы для агітацыі занятыя сьвятамі і канцэртамі. Хто за гэта адказны?

Прэзыдэнцкія выбары — 2020 у Беларусі. Што важна ведаць

- Шостыя ў гісторыі сувэрэннай Беларусі выбары прэзыдэнта прызначаныя на нядзелю, **9 жніўня 2020 году**.
- 65-гадовы **Аляксандар Лукашэнка** кіруе дзяржавай 25 гадоў. Ніводныя прэзыдэнцкія выбары (2001, 2006, 2010, 2015), апроч першых (1994 год), не

прызналі свабоднымі і справядлівымі на міжнародным узроўні.

- Старшыня ЦВК **Лідзія Ярмошына** адхіліла прапановы праваабаронцаў аб дыстанцыйных прэзыдэнцкіх выбарах у час эпідэміі COVID-19, бо «часу для прыняцьця гэтых захадаў ужо няма». Лукашэнка ня бачыў падставаў пераносіць выбары праз пандэмію.
- ЦВК зарэгістраваў 15 ініцыятыўных груп з 55 заявак.
- Аўтару YouTube-канала «Страна для жизни» **Сяргею Ціханоўскаму** Цэнтральная выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, бо ён адбываў 15 сутак арышту і ня мог асабіста падаць дакумэнты. Тады сваю ініцыятыўную групу ў ЦВК заявіла жонка блогера **Сьвятлана Ціханоўская**.
- 29 траўня на перадвыбарчым пікеце жонкі затрымалі Ціханоўскага і яшчэ 9 чалавек. Лукашэнка казаў пра акалічнасьці затрыманьня за 4 гадзіны да таго, як яно адбылося.
- 11 чэрвеня ў «Белгазпрамбанку» і шэрагу іншых кампаній прайшлі ператрусы. У Камітэце дзяржкантролю заявілі, што завялі крымінальныя справы аб легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, і аб ухіленьні ад сплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Старшыня КДК **Іван Тэртэль** сьцьвярджаў, што да гэтых спраў мае дачыненьне патэнцыйны кандыдат у прэзыдэнты **Віктар Бабарыка**. Роўна за 4 гадзіны да заявы Дзяржкантролю **Аляксандар Лукашэнка** расказаў пра акалічнасьці «справы „Белгазпрамбанку“».
- 18 чэрвеня Віктара Бабарыку і яго сына, кіраўніка ініцыятыўнай групы Эдуарда Бабарыку затрымалі.
- 14 ліпеня ЦВК зарэгістраваў кандыдатамі ў прэзыдэнты **Аляксандра Лукашэнку**, **Сьвятлану Ціханоўскую**, **Ганну Канапацкую**, **Андрэя Дзьмітрыева** і **Сяргея Чэрачня**. Не зарэгістравалі **Віктара Бабарыку** і **Валера Цапкалу**.
- Ад пачатку выбарчай кампаніі праваабаронцы налічылі больш за 1300 затрыманых: удзельнікі «ланцугоў салідарнасьці», сябры ініцыятыўных груп, актывісты, палітыкі, блогеры, журналісты і проста мінакі на вуліцы. Сотні чалавек пакаралі адміністрацыйнымі арыштамі і аштрафавалі.